**АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю**

## Сяргей ЛІНГ:

# «МЫТНЫ САЮЗ З РАСІЯЙ НАМ ВЫГАДНЫ – ПРА ГЭТА СВЕДЧАЦЬ ЭКАНАМІЧНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ»

На пасяджэнні Кабінета Міністраў, якое адбылося 7 снежня, абмяркоўваліся прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця і праект бюджэту краіны на наступны год. З асноўным дакладам на нарадзе выступіў намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Лінг. У перапынку карэспандэнт «Звязды» ўзяў у Сяргея Іванавіча кароткае інтэрв'ю.

**– Сяргей Іванавіч, плануемы бюджэт прадугледжвае, што ў наступным годзе Беларусь будзе спажываць параўнальна танныя расійскія энерганосьбіты – размова ідзе пра 10 мільёнаў тон нафты і 14 мільярдаў кубічных метраў газу. Але ж Расія ўжо неаднаразова папярэджвала, што і сама мяркуе перайсці на сусветныя цэны на нафту і газ, – а значыць, не будзе таннага паліва і для Беларусі. Што станецца ў гэтым разе з нашай эканомікай і бюджэтам, які распрацаваў Кабінет Міністраў?**

– Справа ў тым, што закупкі нафты і газу мы робім не з бюджэту – іх купляюць суб'екты гаспадарання – энергетыкі, прадпрыемствы... І гэтыя выдаткі закладваюцца ў сабекошт прадукцыі. Так што калі такое адбудзецца – то проста ўзрасце ўдзельная вага інфляцыйнага фактара, які завозіцца з-за межаў рэспублікі. Такім чынам, гэта не прывядзе да разбурэння бюджэту – але пагоршыць нашы магчымасці па экспарту (наша прадукцыя падаражэе, страцацца некаторыя рынкі збыту з-за неканкурэнтаздольнасці). Таму мы, як кажуць, «ваюем», каб выйсці на адзіныя цэны і рыхтуемся да таго, каб была адзіная мытная прастора, каб у нас склаўся рэжым свабоднага гандлю. Фактычна, мы дабіваемся, каб на нашай тэрыторыі дзейнічалі тыя ж цэны, што і ў Расіі. Пакуль мы не плацім мытную пошліну. А сёння яна складае 30 экю, гэта 35–37 долараў. Пры нашых аб'ёмах гандлю гэта вялізная сума – 700–800 мільёнаў долараў у год. Але калі цэны ўзрастуць, а мытныя пошліны будуць памяншацца – мы будзем рабіць адпаведныя высновы. Мы ж адмовіліся ад таго, каб браць з Расіі транзітны падатак. Дык вось, калі сёння адмена мытных пошлін дае нам выйгрыш – недзе 700 мільёнаў долараў, а нашы страты ад транзіту – каля 300 мільёнаў, то выгада відавочная. Калі суадносіны зменяцца і будзе бачна, што змены не на нашу карысць, то трэба будзе гэтыя падаткі ўводзіць. Але гэта яшчэ – і плюс сапсаваныя адносіны, і многа іншых фактараў. Мы ўсё ж спадзяёмся, што нам удасца вырашыць праблему адзінай мытнай прасторы.

Нам важна мець аднолькавыя з расійскімі цэны на энерганосьбіты не толькі з пункту гледжання таннасці ці дарагоўлі, а найперш – з пункту гледжання рынку. Наша ж прадукцыя – амаль 78 працэнтаў яе – рэалізуецца на расійскім рынку. Нам жыццёва неабходна гэты рынак не страціць.

**– Як вы рэагуеце на рэзкую крытыку «справа» ідэі мытнага саюза з Расіяй? Чым яна, на вашу думку, выклікана і наколькі абгрунтавана?**

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы*

**Гутарыў Валянцін ЖДАНКО.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ